жр3217 07/262
Библиотека АН БССР

Смерць нямецкім акупантам!

Прачытай і перадай другому!

# ПЕРАМОГА

ОРГАН НОВАМЫШСКАГА РАЙКОМА КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 2 Нядзеля, 5 сакавіка 1944 г.

...Уже теперь полным ходом развернулась работа по восстановлению хозяйства и культуры в освобожденных от врага районах. Но это только начало. Нам необходимо полностью ликвидировать последствия хозяйничания немцев в районах, освобожденных от немецкой оккупации. Это большая общенародная задача. Мы можем и должны решить эту трудную задачу в короткий срок.

И. СТАЛИН.

## *Радзіма нясе дапамогу*

Там, дзе прайшлі фашысцкія пагромшчыкі, рабаўнікі і забойцы, засталіся толькі руіны, папялішчы ды брацкія магілкі зажыва зарытых ці косці спаленых савецкіх людзей.

Аграмадныя прасторы нашай сацыялістычнай Радзімы ўжо вызвалены ад зладзейскіх захопнікаў. Пад кіраўніцтвам нашай бальшавіцкай партыі ўся наша Радзіма паклікана на дапамогу ў адбудове народнай гаспадаркі ў вызваленых абласцях і раёнах.

За чатыры месяцы сваёй дзейнасці камітэт пры Саўнаркоме СССР па адбудове народнай гаспадаркі ў вызваленых раёнах правёў велізарную работу. Ад жніўня 1943 года па студзень 1944 года вызваленае сялянства атрымала ад Савецкага ўрада 1 мільён 723 тысячы 200 галоў жывёлы, поўнасцю вызвалены ад дзяржаўных паставак 1 мільён 62 тысячы 352 гаспадаркі воінаў Чырвонай Арміі і партызан Айчыннай вайны. На засеў палёў выдадзена 96 тысяч 324 тоны добраякаснага насення. Звернута з эвакуацыі 5372 трактары, адрамантавана і пабудавана 326 тысяч 450 дамоў у якія ўселена 1 мільён 396 тысяч 614 чалавек. Сельгасбанкам СССР выдана сялянам, рабочым і служачым на індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва 36 мільёнаў 265 тысяч рублёў.

Асаблівыя клопаты праяўляе Савецкі ўрад аб дзецях воінаў Чырвонай Арміі, партызан і сірот-дзяцей, замучаных немцамі бацькоў. Распачалі працу 9 сувораўскіх ваенных вучылішч, у якіх навучаецца 4588 дзяцей. Адкрыта 23 спецыяльных рамесніцкіх вучылішчы, у якіх навучаецца 9000 дзяцей і 118 спецыяльных дзіцячых дамоў, куды прынята 19430 дзяцей і г. д.

Гэтыя факты і лічбы з усёй сілай выкрываюць правакацыйную, дурную хлусню фашыстаў аб тым, нібы-та савецкая ўлада праследуе людзей, якія былі пад нямецкай акупацыяй.

Гэтыя лічбы з'яўляюцца красамоўным сведчаннем велізарных клопатаў савецкага ўрада і бальшавіцкай партыі аб людзях, якія перажылі жахлівую нямецкую акупацыю.

## Братэрская дапамога

У горад Яраслаўль прыехала дэлегацыя ад насельніцтва вызваленых раёнаў Беларусі. Пад кіраўніцтвам сакратара Яраслаўскага абкома ВКП(б) тав. Міхайлава створан камітэт па аказанні сістэматычнай дапамогі грамадскасці Яраслаўскай вобласці для насельніцтва тых раёнаў БССР, якія вызвалены Чырвонай Арміяй з-пад нямецкай акупацыі.

### НА ФРОНТАХ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

## НА НАРВУ, ПСКОВ И ВИТЕБСК НАСТУПАЮТ ВОИНЫ КРАСНОЙ АРМИИ

Войска Ленинградского фронта с боем форсировали реку Нарву, южнее гор. Нарва, и продолжая развивать наступление на западном берегу реки, прорвали сильно укрепленную оборону немцев и захватили плацдарм врага протяжением в 35 клм. и в глубину на 15 клм. Наши войска с боями овладели несколькими населенными пунктами в Эстонской ССР и перерезали железную дорогу НАРВА-ТАЛЛИН в районе железнодорожной станции АИЗАРЕ, 15 клм. западнее города НАРВА.

На Псковском направлении наши войска вели наступательные бои в ходе которых заняли несколько сот населенных пунктов. Наши войска перерезали железную дорогу Псков-Идрица.

На Витебском направлении наши войска вели наступательные бои и заняли ряд населенных пунктов, в том числе: Пекари, Обухово, Селюты, Батали, Ташково, Вороны.

На Островском направлении наши войска успешно развивали наступление, овладели районным центром Ленинградской области Сашичино и рядом других населенных пунктов.

Южнее города КРИВОЙ РОГ наши войска, форсировав реку Ингулец, овладели рядом населенных пунктов, а также железнодорожными станциями ИНГУЛЕЦ, НИКОЛО-КОЗЕЛЬСК.

## Успешные бои югославских патриотов

После того, как немцы 26-го февраля, при поддержке танков заняли гор. Глина, части Народно-Освободительной Армии на следующий день выбили немцев из этого города, несмотря на участие в боях танков и авиации врага.

Части 16-й дивизии Югославской Народно-Освободительной Армии в упорных боях отбили все попытки немцев прорваться и нанесли им тяжелые потери.

## ПАН АСТРОЎСКІ БРЭША

Беларускія фашысты
Дужа чэшуць языкі,
Каб на тыя языкі
Селі гузы, як быкі.
(З народных прыпевак).

Днямі фон-Готтберг дазволіў свайму лёкаю Астроўскаму крыху пабрахаць. Пан Астроўскі, як прэзідэнт „беларускай здрады" аб'ехаў гарады Слуцк, Слонім, Баранавічы і даў інтэрвью карэспандэнту фашысцкай „Беларускай газеты" аб сваіх уражаннях з падарожжа. Чорная шайка здраднікаў (прэзідэнт і карэспандэнт) нахлусілі адзін другому і не чырванеючы надрукавалі гэтую хлусню на брудных лістках сваёй газеты.

Як відаць, асабліва здраднікаў хвалюе партызанскі рух на Беларусі, які, у сувязі з набліжэннем Чырвонай Арміі, перарастае ў сапраўднае ўсеагульнае народнае паўстанне. Пан Астроўскі запэўняў свайго карэспандэнта, што беларускае сялянства вельмі дамагаецца, каб яму хутчэй далі ў рукі зброю, бо тапарамі і віламі цяжка змагацца з партызанамі.

Дзе бачыў гэты чорны драбежнік такое сялянства? Няўжо каты з беларускай галіцыі і СД, якія сустракалі і слухалі пана Астроўскага, з'яўляюцца прадстаўнікамі і выразнікамі настрояў і жаданняў беларускага народа? Каму гэта невядома, што наш народ бяжыць ад карных нямецкіх экспедыцыяў, як ад якой пошасці.

Бягуць куры ў крапіву,
А сабакі ўздоўж сяла,
Уся спалохана скаціна —
У вёску едзіць гестапа,

Так гаворыцца ў народнай прыпеўцы.

Бясспрэчна беларусы прагнуць як мага больш здабыць зброі... дзеля таго, каб як больш знішчыць ёй гітлераўцаў і іх прыхвасняў.

Хто як не мы, беларусы, узброілі, накармілі і апранулі лепшых сваіх сыноў — партызан; з нас, беларусаў, складаецца пераважная частка партызан у нашай краіне. Нава беларуская мова гучыць у партызанскай масе; мы, беларусы, у суровых умовах падполля і гітлераўскага тэрора стварылі антыфашысцкі беларускі друк.

А вось што апавядае група сялянскіх хлапцоў, якія прыйшлі ў партызанскі атрад імя Суворава. „Мы былі загнаны ў „самаахову". Гарнізон быў размешчан у мястэчку Снове. Нас цэлыя дні муштравалі са зброяй без патронаў. Пасля муштры зброю адбіралі ад нас і каля склада са зброяй ставілася спецыяльная ахова. Вартавым па гарнізону давалася вінтоўка без магазіна і тры патроны. Стоячы на варце, мы высыпалі порах, а гільзы напаўнялі пяском. З самага першага дня мы падалі падбіраць момант, каб здабыць зброю і са зброяй пайсці ў партызаны. Але на працягу ўсяго часу нас да зброі не дапускалі. Мы вымушаны былі ўцякаць з „самаахоўы" без зброі".

Ці зразумела вам, паны астроўскія, аб чым думаюць беларускія сялянскія сыны?

Хто з беларускага народа паверыць вашай брахні?! Не падтрымку вашай „беларускай здрадзе" рыхтуе народ, а яму рые ўсяму вашаму чорнаму кагалу здраднікаў і загінеце вы ў ёй, як сабакі. А патомкі будучых сонечных дзён, якія з'явяцца на папялішчах нашай пакутнай бацькаўшчыны, праклёнамі ўспамянуць вашу „беларускую здраду".

Б. Р-кі.

## *Вынік будзе, таварыш камандзір!*

Не было такога выпадку, каб камандзір узвода Васіль Паўлавіч С. і старшына роты Сяргей К. з атрада імя Суворава вярнуліся з баявога задання без выніку.

Атрымаўшы баявое заданне ад камандзіра атрада, яны лаканічна паўтараюць сваё пастаяннае „Вынік будзе, тав. камандзір" і з поўнай надзеяй на ўдачу накіроўваюцца на выкананне баявога задання.

На працягу апошніх месяцаў яны спусцілі пад адхон тры варожых эшалоны, у тым ліку два з жывой сілай ворага.

Асабліва задаволенымі з'явіліся баявыя таварышы з апошняга задання. Смелыя падрыўнікі прабраліся да важнай чыгуначнай магістралі. Цёмная ноч. Чутна як на шпалах грукочуць вартаўнікі — фрыцы. Часам адзін за другім рухаюцца цягнікі. Выбіраецца зручны момант і міна кладзецца паміж рэек. З усходу надыходзіць пасажырскі цягнік з ярка асветленымі вагонамі. Раптам выбух. Полымя агню, трэск паравоза, вагонаў... А ў выніку паравоз і чатыры чатырохвосныя пасажырскія вагоны разбіліся ўшчэнт. Месца крушэння цягніка на працягу трох дзён было абкружана спецыяльнай аховай. Шырока рухаліся грузавыя машыны ад месца крушэння ў горад, перавозячы трупы і калек і [illegible]. Рух па чыгунцы быў спынены на двух калях на працягу сутак.

Разведчык.

## „ЧОРНЫЯ БОБІКІ" АПЯКЛІСЯ

Маўчадзкая паліцыя ў складзе 65 асоб рашыла даць бой партызанскаму атраду, якім камандуе Іван К. Доўга рыхтаваліся „бобікі" да гэтага боя. Крадучыся яны прабраліся да месца, дзе знаходзіўся атрад, і занялі выгадныя пазіцыі на ўзвышшах і на ўскраіне лесу. Вораг быў узброен гранатамётамі і станковымі кулямётамі. Нечакана ворага выявілі партызаны. Узвод партызан пайшоў у атаку. З крыкамі „ура" кінуліся героі-мсціўцы на ворага. Нічога не дапамагло яму. Паліцэйскія кінуліся наўцёкі. У выніку бою вораг страціў 8 забітымі.

Удзельнік бою.

Група партызан пад камандай камандзіра роты К. з атрада імя Суворава на чыгуначнай магістралі перарвала тэлеграфную сувязь ворага з 16-ці праводоў. Тэлеграфная сувязь ворага была спынена на 50 гадзін. Аперацыю група праводзіла пад абстрэлам ворага з бункераў.

Рэдкалегія.